# Рассакрэчана… Двойчы загінуўшая вёска Рулёва

**Кіраўнік навукова-даследчай работы**
Святлана Казіміраўна Астрэйка,
настаўнік гісторыі

Веска Рулёва была спалена ў гада Вялікай Айчыннай вайны, але яе няма на мемарыяле спаленых вёсак у Хатыні...



Трагедыя Хатыні паўтарылася ў **433** беларускіх вёсках. Яны былі адроджаны пасля вайны і ўвекавечаны на элеменце мемарыяла «Сімвалічныя дрэвы жыцця». На сімвалічных галінах дрэў у алфавітным парадку пералічаны назвы 433 беларускіх вёсак, якія былі знішчаны фашыстамі разам з жыхарамі, але АДРОДЖАНЫ пасля вайны.

# Факт

Вёска Рулёва сапраўды размешчана на дрэве **адроджаных** вёсак.



# Мэта даследавання

Высветліць, чаму спаленая у гады Вялікай Айчыннай вайны, вёска Рулёва Капыльскага раёна аднесена да ліку адроджанных вёсак, калі на самой справе яе не існуе.

# Задачы

1. Сабраць і вывучыць літаратуру па гісторыі вескі, апытаць людзей, якія памятаюць лёс вёскі;
2. Прасачыць гістарычны лес вёскі Рулёва, устанавіць храналагічную паслядоўнасць гістарычных падзей;
3. Установіць сувязь надпісаў у мемарыяльным комплексе Хатынь і адсутнасці вёскі на самой справе;
4. Сабраць інфармацыю пра лёс іншых вёсак Капыльскага раёна.

# Гіпотэза

Дакладны  ці памылковы  зроблены надпіс РУЛЁВА на дрэве адроджанных вёсак на мемарыяле у Хатыні.

# Метады і прыёмы атрымання інфармацыі:

Метад гістарычнай рэканструкцыі;

Работа (пошук звестак) ў сетцы Інтэрнэт;

Інтэрв'юіраванне (апытанне сталых людзей - дзяцей вайны);

# Аб’ект даследавання:

вёска Рулёва Капыльскага раёна, Мінскай вобласці.

# Прадмет даследавання:

гістарычныя падзеі ў даваенны, ваеннны і пасляваенны час, якія звязаныя з вёскай Рулёва

# Гістарычнае  мінулае вёскі Рулёва

Вёска Рулёва, адзін з прыгожых куточкаў беларусі,якая знаходзілася паміж вёскамі  Шамы і Вялешына,што ў Капыльскім раёне Мінскай

Яна пачала сваё існаванне як засценак, яшчэ ў пачатку 18 стагоддзя. Арандатарам засценка быў шляхціч Якаў Статкевіч.

Аб паходжанні назвы вёскі Рулёва гістарычныя звесткі адсутнічаюць. Але ёсць думка, што назва вёскі паходзіць ад слова "Рулі".

“Рулі” –  гэта даўняя страва беларусаў. У астуджаную гатаваную ваду крышаць жытні хлеб, цыбулю, кроп, падсольваюць, запрауляюць алеем. У падсалоджаную ваду ці малако крышаць пшанічны або жытні хлеб, булку.

# «Свята ўраджаю» (ням. «Erntefest»)

Кодавая назва карнай аперацыі нямецкіх акупацыйных улад супраць партызан і насельніцтва на тэрыторыі Грэскага, Капыльскага, Пухавіцкага, Слуцкага, Уздзенскага раёнаў Мінскай вобласці. Яна праводзілася ў студзені – лютым 1943 года.

На Капыльшчыне падчас карных аперацый фашысцкія захопнікі спалілі ***33*** населеныя пункты. Многія з іх не адрадзіліся. Некаторыя з іх:

**Пас. Прагрэс,**

**в. Жавулкі,**

**в. Масявічы,**

**в. Рулёва,**

**в. Калодзезнае.**

# ✔ Масявічы



| | |
|---|---|
| Раён | Капыльскі |
| Вобласць | Мінская |
| Даваенны раён | Капыльскі |
| Даваенная вобласць | Мінская |
| Дата разбурэння | Сакавік 1943 г. |
| Хат да вайны | 32 |
| Людзей да вайны | 138 |
| Разбурана хат | 32 |
| Забіта людзей | 130 |
| Пошукавыя дадзеныя | НАРБ. Ф.1440. Оп.3. Д.771. Л.147-154; НАРБ. Ф.4П. Оп.33а. Д.299. Л.56-63; Ф. 1330 Оп. 1 Д. 1 Л. 132; Ф. 1405 Оп. 1 Д. 516 Л. 60. |

# ✔ Жавалкі



| | |
|---|---|
| Раён | Капыльскі |
| Вобласць | Мінская |
| Даваенны раён | Капыльскі |
| Даваенная вобласць | Мінская |
| Дата разбурэння | Люты 1943 г. |
| Хат да вайны | 156 |
| Людзей да вайны | 785 |
| Разбурана хат | 121 |
| Забіта людзей | 519 |
| Пошукавыя дадзеныя | НАРБ. Ф.1405. Оп.1. Д.516. Л.60; НАРБ. Ф.4п. Оп.33а. Д.299. Л.56-63; НАРБ Ф. 1450 Оп. 4 Д. 207 Л. 33-35. |

# ✔ Пасёлак Прагрэс




| | |
|---|---|
| Раён | Капыльскі |
| Вобласць | Мінская |
| Даваенны раён | Капыльскі |
| Даваенная вобласць | Мінская |
| Дата разбурэння | Люты 1943 г. |
| Хат да вайны | 14 |
| Людзей да вайны | 46 |
| Разбурана хат | 10 |
| Забіта людзей | 16 |
| Пошукавыя дадзеныя | НАРБ. Ф.1405. Оп.1. Д.516. Л.60. |

# ✔ Калодзезнае




| | |
|---|---|
| Раён | Капыльскі |
| Вобласць | Мінская |
| Даваенны раён | Капыльскі |
| Даваенная вобласць | Мінская |
| Дата разбурэння | Люты 1943 г. |
| Хат да вайны | 58 |
| Людзей да вайны | 247 |
| Разбурана хат | 57 |
| Забіта людзей | 196 |
| Пошукавыя дадзеныя | НАРБ. Ф.4П. Оп.33а. Д.299. Л.56-63; НАРБ. Ф.1330. Оп.1. Д.1. Л.132; НАРБ. Ф.1405. Оп.1. Д.516. Л.60. |

# ✔ Вялікія Прусы




| | |
|---|---|
| Раён | Капыльскі |
| Вобласць | Мінская |
| Даваенны раён | Капыльскі |
| Даваенная вобласць | Мінская |
| Дата разбурэння | Верасень 1942 г. |
| Хат да вайны | 121 |
| Людзей да вайны | 582 |
| Разбурана хат | 121 |
| Забіта людзей | 255 |
| Пошукавыя дадзеныя | НАРБ. Ф.1450. Оп.4. Д.198. Л.59; НАРБ. Ф.4п. Оп.33а. Д.299. Л.56-63. |

# ✔ Аксаміты



Работа па ўстанаўленню звестак праводзілася вучнямі Грозаўскай школы Капыльскага раёна.

У далейшым плануем унесці ў табліцу звесткі больш дакладныя.

# ✔ Рулёва



| | |
|---|---|
| Раён | Капыльскі |
| Вобласць | Мінская |
| Даваенны раён | Капыльскі |
| Даваенная вобласць | Мінская |
| Дата разбурэння | Люты 1943 г. |
| Хат да вайны | 11 |
| Людзей да вайны | 26 |
| Разбурана хат | 11 |
| Забіта людзей | 22 |
| Пошукавыя дадзеныя | НАРБ. Ф.4п. Оп.33а. Д.299. Л.56-63; ЗГА в г. Слуцке Ф. 3790 Оп. 1 Д. 6 Л. 17. |

# Матэрыялы Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь

*Фонд № 4а Опись №33а. Дело №299*






ПАРТАРХИВ ЦК КП БЕЛОРУССИИ

Фонд № 4 Опись № 33а Ед. хр. № 299

Центральный Комитет КП(б) Белоруссии
(название фонда)

Оргинструкторский отдел
(название структурной части)

Докладные, отчеты и справки секретарей ЦК ЛКСМБ и подпольных комсомольских работников о работе комсомольских организаций Белоруссии в тылу противника. Протоколы подпольных комсомольских конференций Кличевской КСМ организации и бригады Мельникова.

Начато 19. декабря 1942 г.

Окончено 2. августа 1943 г.

На 201 листах

...ица БССР, типогр. им. В. М. Молотова, Дом Советов, з. №6821, 31.XII.54 г., т. 4000

# Фонд № 4а Опись №33а. Дело №299



РАССЕКРЕЧЕНО

ЦК КП/б/ БЕЛОРУССИИ

тов. З А К У Р Д А Е В У.

С п р а в к а
о дислокации и работе комсомольских организаций в тылу противника.

В настоящее время на оккупированной территории Белоруссии действуют следующие комсомольские организации:

Группа ЦК ЛКСМБ – 2 секретаря ЦК, инструктора и связники.

1. Витебская область. Обком ЛКСМБ – 3 секретаря, ответорганизаторы и связники.

На территории Витебской области действует 19 райкомов ЛКСМБ; в 15-и из них утвержден состав бюро райкомов.

Всего по Витебской области насчитывается комсомольцев – 5354 человека, которые об"единены в 479 комсомольских организаций, в том числе подпольных – 350, охватывающих 1474 человека.

2. Минская область. Уполномоченный ЦК ЛКСМБ по области – секретарь ОК тов.Пармон, 5 человек помощников уполномоченного, три межрайонных подпольных комитета /Минский, Борисовский, Слуцкий/, 12 райкомов комсомола и 9 уполномоченных ЦК ЛКСМБ по районам.

Всего, по имеющимся данным, в Минской области организовано 122 подпольных комсомольских организации, охватывающих 457 комсомольцев,

3. Могилевская область. Уполномоченный ЦК ЛКСМБ по области, три его помощника, 15 уполномоченных ЦК ЛКСМБ по районам с их помощниками. По неполным данным в Бобруйском межрайцентре работает 40 подпольных комсомольских организации.

4. Гомельская область. 2 секретаря ОК ЛКСМБ – один из них уполномоченный ЦК по области, второй помощник уполномоченного, три помощника, 7 уполномоченных по районам.

5. Полесская область. Один РК ЛКСМБ – Копаткевичи, 6 уполномоченных ЦК ЛКСМБ по районам.

По Копаткевическому району создано 18 подпольных комсомольских организаций.

6. Вилейская область. Уполномоченный ЦК ЛКСМБ по области, 4 помощника, 9 уполномоченных по районам и один РК ЛКСМБ /Докшицы/. По имеющимся данным в этом районе создано 18 подпольных комсомоль-



- 45 -

удался. Операции немцев против партизан, проведенные в последнем полугодии, свидетельствуют о том, что немцы, будучи не в силах истребить вооруженные силы партизан, производят в районах развитого партизанского движения поголовное истребление мирного населения, которому по каким-либо причинам не удалось уйти из рук немцев, выжигание сел и деревень, захват и убой скота, вывоз и порчу продовольствия. Истребить население, как опору и резерв партизанского движения, терроризовать оставшихся в живых, – таков расчет немецких карателей. С конца 1942 г. по настоящее время в южной части Белоруссии сожжены сотни населенных пунктов и уничтожены десятки тысяч мирного населения, в том числе: Копыльский район – Жаулки – уничтожено до 600 человек, Мосевичи – 300, Руднев, Б.Рашка – 60 чел. повешено, Колодезное – 100 чел., Пруси – 510 чел., Рыжево – полностью, Песочное (сожжена частично, ... пункты, где было проведено частично ... людей – Ирочки, Давы.

# Месца трагедыі вёскі Рулёва і помнік загінуўшым.





9200 населеных пунктаў былі разбураны
і спалены, больш за 5000 былі знішчаны разам
з усім ці часткай насельніцтва ў ходзе карных аперацый. 186 вёсак разам з людзьмі згарэлі датла.



# ✔ Хатынь



| | |
|---|---|
| Раён | Лагойскі |
| Вобласць | Мінская |
| Даваенны раён | Плешчаніцкі |
| Даваенная вобласць | Мінская |
| Дата разбурэння | 22 сакавіка 1943 г. |
| Хат да вайны | 26 |
| Людзей да вайны | 156 |
| Разбурана хат | 26 |
| Забіта людзей | 149 |
| Пошукавыя дадзеныя | НАРБ. Ф.391. Оп.1. Д.67. Л.1, 2, 5; НАРБ. Ф.510. Оп.1. Д.45. Л.116, 118, 120-121; НАРБ. Ф.1363. Оп.1. Д.2719. Л.52; НАРБ. Ф.1405. Оп.1. Д.794. Л.26-27; НАРБ. Ф.1450. Оп.4. Д.168. Л.70, 71-72. |

# Параўнальныя характарыстыкі вёсак

| Назва вёскі | **Рулёва** | **Хатынь** |
|---|---|---|
| Да вайны | Вёска была невялікай, усяго 8 – 12 хат, 26 чалавек. | 26 двароў |
| Дата разбурэння | Жыццё у вёсцы спынілася **23 лютага 1943 г.** Нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску: 11 дамоў, загубілі 22 жыхары. | **22 сакавіка1943 г.** загінула 149 жыхароў, у тым ліку 75 дзяцей. Была спалена ўся вёска, 26 двароў. |
| Архіўныя дадзеныя | Згодна архіўных дадзеных Рулёва была спалена поўнацю | Хатынь была спалена поўнасцю. |
| Пасля 1945 года | У жывых засталося 2 жыхары. Пасля вайны было адбудавана 3 хаты. | Не ўзрадзілася. |
| Чэрвень 1969 года | **На чэрвень 1969 года** ў вёсцы пражывала 13 жыхароў. | **5 чэрвеня 1969 году**, на месцы вескі Хатынь, быў пабудаваны мемарыяльны комплекс. |
| 1976 год | **Не існуе.** | - |

# Вывад:

Надпіс на “Дрэве адроджаных вёсак” зроблены правільна, так як на момант закладкі Мемарыяльнага комплексу Хатынь, у вёсцы Рулёва пражывала 13 жыхароў.

**З 1976 года вёска перастала існаваць**.

# ✔ Плануецца ўстаноўка QR кодаў на помніку кожнай загінуўшай вёскі





















Да 70-годдзя  Хатынскай трагедыі Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь і Беларускі фонд міру пры падтрымцы Расійскага фонду садзеяння актуальным гістарычным даследаванням "Гістарычная памяць" прэзэнтуюць электронную базу даных  “Беларускія вёскі, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны”

# Планы на будучае:

- ✔ Праводзіць кожны год  урок памяці для вучняў установы адукацыі 23 лютага

- Да месца, дзе адбылася трагедыя, няма ўказальнага знаку. Было вырашана звярнуцца да кіраўніцтва Капыльскага аддзелу адукацыі спорту і турызму з прапановай аб устанаўленні знака-указальніка да месца трагедыі. Ірына Іванаўна Абас згадзілася нам дапамагчы і было складзена хадатайніцтва на імя начальніка Капыльскага ДРСУ аб устаноўцы знаку.
- Працягласць працы - 6 месяцаў.

# ✔ Мемарыялізацыя




Давесці да канца работу па устанаўленню знака-указальніка да месца, дзе адбылася трагедыя.

- ✔ Правесці работу па далейшаму вывучэнню лёсаў іншых спаленых вёсак Капыльскага раёна (усіх было спалена 33)

## Вывады:

На аснове вынікаў майго даследавання ўстаноўлена:

- ✔ вёска Рулёва існавала на тэрыторыі Капыльскага раёна Мінскай вобласці і мела трагічнае мінулае.
- ✔ Згодна матэрыялаў Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь і іншых крыніц, змог даведацца, што вёска, Рулёва была спалена поўнасцю, як і многія іншыя вёскі Капыльскага раёна пад час карнай аперацыі "Свята ўраджаю" 23 лютага 1943.
- ✔ Былі спробы адраджэння вёскі. На чэрвень 1969 года ў вёсцы пражывала 13 жыхароў.
- ✔ Надпіс РУЛЁВА размешчана на дрэве адроджаных вёсак у Хатыні правільна. Бо на момант закладкі мемарыялу ў Хатыні, у ёй былі жыхары.
- ✔ З 1976 годзе вёска не існуе.

- Далей і далей ад нас адыходзяць тыя грозныя, трагічныя дні вайны. У памяці усіх пакаленняў павінна застацца мужнасць і стойкасць нашага народа, а таксама  тыя выпрабаванні, якія прыйшлося перанесці людзям.

- Наша памяць - гарант таго, што будзем помніць трагічныя старонкі гісторыі.

- Без мінулага - няма будучага.

**СПІС ВЫКАРАСТАНЫХ КРЫНІЦ:**


1. Статкевіч-Чабаганаў, А. В. Я – сын Ваш Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба «Касцеша». Карафа-Корбуты герба «Корчак»/ А. В. Статкевіч-Чабаганаў. – Мінск:Роднае слова, 2011. – 576 с.

2. В феврале 75 лет назад фашистами было сожжено пять населенных пунктов в Копыльском районе [Электронный ресурс] / Районная газета «Слава працы». –Режим доступа: http://www.kopyl.by/?p=64224  Дата доступа: 14.01.2021.

3. Памяць: Капыльскі р-н: Гіст.-дак. Хронікі гарадоўі р-наўБеларусі / Уклад. А. А. Марціновіч; Рэд.: Ф.К. Абрамчык і інш. – Мн.: Бел. Навука, 2001.–638 с.

4. Белорусские деревни, сожжённые в годы Великой Отечественной войны. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://db.narb.by/search/ Дата доступа: 14.01.2021.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь Ф.4п. Оп.33а. Д.299. Л.56-63;Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т.13. – Мн.: БелЭн, 2001. – С.439.

6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. кн.1. – Мн.: БелСЭ, 1987.–С.192.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь Фонд 4п. – Оп.33а. – Д. 299. Докладные, отчёты и справки секретарей ЦК ЛКСМБ и подпольных комсомольских работников о работе комсомольских организаций Беларуси в тылу врага противника. Протоколы подпольных комсомольских конференций Кличевской КСМ организации и бригады Мельникова. – Л.56-63.

8. Аксаміцкая трагедыя [Электронный ресурс] / Районная газета «Слава працы». Режим доступа: http://www.kopyl.by/?p=24953  Дата доступа: 25.03.2020

9. Чтобы помнили трагедыя [Электронный ресурс] / Районная газета «Слава працы». –Режим доступа: http://www.kopyl.by/?p=48850- Дата доступа: 24.02.2020

10. Успаміны аб жудасных падзеях Умрэйкі Яраслава Лук’янавіча.

*Дзякуй за ўвагу!*

**Назва:** Рассакрэчана… Двойчы загінуўшая вёска  Рулёва

**Аўтары:** Астрэйка Святлана Казіміраўна

**Email:** ivanyanushko01@gmail.com

**Населеный пункт:** аг. Пясочнае